АКЦЫІ

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БЕЛАРУСІ



# ПРА РАДКІ, АБПАЛЕНЫЯ ВАЙНОЙ

**СКІДЗЕЛЬ. Да прысвечанай Дню Перамогі грамадска-літаратурнай акцыі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» далучылася паэтэса, публіцыст, бібліятэкар Тамара Мазур. 9 мая на стылізаванай бібліятэчнай прасторы Гродзенскага культурна-інфармацыйнага цэнтра ў Цэнтральным парку горада Скідзеля з удзелам Тамары Міхайлаўны адбыліся тэматычныя гучныя чытанні.**



Мерапрыемства прайшло каля выстаўкі новых кніг аб ахвярах фашызму, героях і значных падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, бібліятэкар Скідзельскай гарадской бібліятэкі Тамара Мазур выступіла ў якасці вядучай, тым самым далучыўшыся да традыцыйнай акцыі пісьменнікаў Гродзенскай вобласці «Пад мірным небам Беларусі».

Для чытання былі прадстаўлены паштоўкі з патрыятычнымі вершамі аб скідзельскіх славутасцях і кніжныя закладкі з найбольш кранальнымі ўрыўкамі з твораў вядомых паэтаў і выявамі вокладак іх паэтычных зборнікаў.

Дапаўненнем да «радкоў, абпаленых вайной», сталі паштоўкі з картай маршрута «Дарога памяці» ў ваколіцах Скідзеля, якія выклікалі асаблівую цікавасць у гасцей горада.

Прысвечаная 81-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» працягваецца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:**

* Выбітны талент чытача патрыятычных вершаў прадэманстравала Святлана Сарокіна са Скідзельскага дзяржаўнага каледжа, кіраўнік Народнага літаратурна-краязнаўчага музея імя Міхася Васілька.
* Найбольшую цікавасць да выстаўкі новай сацыяльна-значнай літаратуры праявіў Рафал Медзяноўскі.
* Шчырыя гутаркі пра вядомыя і малавядомыя ваенныя вершы каля чытацкага століка вяліся на працягу ўсяго сяткавання Дня Перамогі ў Скідзелі.
* Алё, паэты з мінулага стагоддзя, мы вас слухаем.










СКІДЗЕЛЬ






Музей в
чемодане